УДК 796.011.5

***Уладзімір Паўлавіч Люкевіч***
*канд. філас. навук, дац., дац. каф. спартыўных дысцыплін і методык іх выкладання*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
***Uladzimir Lukievich***
*Candidate of Philosophical Sciences, Associate Professor,*
*Associate Professor of the Department of Sports Disciplines and Methods of their Teaching*
*at the Brest State A. S. Pushkin Univercity*
e-mail: lucul@brsu.brest.by

# СПАРТЫЎНАЯ ЭТЫКА: ГЕНЕЗІС FAIR PLAY

*Паняцце Fair play у сучасным спорце з'яўляецца важнейшым маральным рэгулятарам, які вызначае сумленныя і высакародныя паводзіны ў працэсе трэніровак і спаборніцтваў і характарызуецца доўгатэрміновай гісторыяй свайго развіцця. У цэлым спорт з канца XIX ст. да 20-х гг. XXI ст. істотна змяніў сваю ўнутраную сутнасць. Калі на працягу першых этапаў свайго станаўлення ён кіраваўся дэвізам «Галоўнае не перамога, а ўдзел», то затым па меры яго распаўсюджвання ўсталяваўся дэвіз «Citius. Altius. Fortius» (Хутчэй. Вышэй. Мацней). Аднак тэндэнцыі прафесіяналізацыі і камерцыялізацыі спорту прывялі да таго, што стала пераважаць ідэя «Перамога любой цаной». Такім чынам пачынаюць павялічвацца праблемы, звязаныя з махлярствам, прадузятым судзействам, допінгавым злоўжываннем і інш. Шматлікія парушэнні правіл спаборніцтваў з боку асобаў, якія так ці інакш уплываюць на канчатковы вынік змаганняў, прымусілі міжнароднае спартыўнае кіраўніцтва звярнуць самую пільную ўвагу на этычны кампанент гэтага віду дзейнасці.*

***Ключавыя словы:*** *Fair play, спорт, этыка, генэзіс, алімпізм, каштоўнасці, глабалізацыя.*

## *Sports Ethics: Genesis of Fair Play*

*Fair play in modern sports is the most important moral regulator that denotes honest and noble behavior in the process of training and competition, and is characterized by a long history of its development. In general, sport from the end of the 19th century to the twenties of the 21st century has significantly changed its inner essence. During the first stages of its formation it was guided by the motto «The main thing is not victory, but participation». Then as it spread, the slogan «Citius. Altius. Fortius» began more important. However further, the tendencies of professionalization and commercialization of sports have led to the fact that the idea of «Victory at any cost» has become the dominant one. From here, at an alarming rate, problems begin to increase, which are associated with deception, biased refereeing, doping etc. Numerous violations of the rules of the competition by persons who in one way or another affect the final result of the struggle, forced the top management in international sports to pay close attention to the ethical component of this type of activity.*

***Key words:*** *Fair play, sports, ethics, genesis, Olympism, values, globalization.*

## Уводзіны

Гуманістычныя ідэі, якія складалі аснову алімпійскага руху, уяўляліся найважнейшым фактарам развіцця спорту на мяжы XIX–XX ст. На думку П. дэ Кубертэна, яны павінны былі прыўнесці разуменне «чыстага» спаборніцтва, бескарыслівасці, імкнення атлета да фарміравання гарманічнай асобы, непадзельнага адзінства спорту, культуры і адукацыі, а таксама стварэнне такога ладу жыцця, які базіруецца на рада-сці ад намаганняў, на каштоўнасцях добрых прыкладаў у выхаванні, павазе да ўсеагульных этычных прынцыпаў.

Дэталізацыя гэтага падыходу знайшла сваё адлюстраванне ў Алімпійскай хартыі. У прыватнасці, яе фундаментальныя прынцыпы вызначаюць алімпізм як філасофію жыцця, дзе спалучаюцца якасці цела, волі і розуму і паважаюцца агульначалавечыя этычныя прынцыпы, а галоўнай мэтай з'яўляецца садзейнічанне спорту ў фарміраванні гарманічнага развіцця чалавецтва і захаванне чалавечай годнасці. Заняткі спортам трактуюцца як неад'емнае права чалавека: без усялякай дыскрымінацыі, у духу сяброўства, салідарнасці і Fair play, на аснове палітычнага нейтралітэту. Асабліва падкрэсліваецца, што не павінна быць ніякага прыгнёту з прычыны расы, колеру скуры, гендарных адрозненняў, сексуальнай арыентацыі, мовы, нацыянальнага ці сацыяльнага паходжання, веравызнання, маёмаснага паказальніка, нараджэння і інш. [13, с. 11–12].

Этычны кодэкс, які таксама падрыхтаваны Міжнародным алімпійскім камітэтам, удакладняе некаторыя этычныя палажэнні, якія датычацца наступных аспектаў:

1) павага да чалавечай годнасці;

2) адмова ад усіх форм дамаганняў і злоўжыванняў, як фізічных, прафесійных, так і сексуальных, а таксама іншых фізічных ці псіхічных траўмаў;

3) забеспячэнне ўмоў бяспекі, дабрабыту і медыцынскага абслугоўвання ўдзельнікаў спаборніцтваў, што спрыяе іх фізічнай і псіхічнай раўнавазе [7, с. 13].

Аднак практыка спартыўнай дзейнасці на працягу XX–XXI ст. неаднаразова дэманстравала шматлікія выпадкі махлярства і непрыстойных паводзін з боку ўдзельнікаў спаборніцтваў. Каб неяк супрацьстаяць такому становішчу, была ўведзена алімпійская клятва спартсменаў, якая ўпершыню прагучала ў 1920 г. падчас Алімпіяды ў бельгійскім Антвэрпэне (Antwerpen). Тым не менш з сярэдзіны мінулага стагоддзя і па сённяшні дзень працягваецца ўпартая барацьба за захаванне ў спорце духу сумленных і высакародных спаборніцтваў, без падману, без прадузятасці ў судзействе, без допінгавага ўмяшальніцтва.

Адным з найбольш вядомых сродкаў захавання ў спорце «чысціні» барацьбы на спаборніцтвах з’яўляецца Fair play, альбо ў найбольш шырокім разуменні – паняцце сумленнай і высакароднай гульні. Яго прынцыпы вызначаюць арыентацыю спартсменаў на такія паводзіны, якія не даюць сумненняў у метадах, што выкарыстоўваюцца для атрымання перамогі ці дасягнення адпаведнага выніку ў сістэме спартыўнай дзейнасці. Fair play займае належнае месца ў спартыўнай этыцы і абазначае нешта большае, чым толькі гульня паводле вызначаных правіл. Прынцыпы Fair play распаўсюджваюцца таксама на трэнераў, арбітраў, лекараў, а ўвогуле – на ўсіх тых асоб, якія так ці інакш маюць адносіны да спорту.

Каб спрыяць развіццю і распаўсюджванню прынцыпаў Fair play, у 1964 г. пад эгідай Міжнароднай рады па спартыўнай навуцы і фізічнай адукацыі быў створаны Міжнародны камітэт Fair play, а пазней у 1994 г. паўстаў еўрапейскі рух Fair play. Дзейнасць названых арганізацый накіравана на прапаганду ідэй сумленнай гульні. Акрамя таго, штогадова адбываецца прысуджэнне ўзнагарод для тых спартсменаў, якія вызначыліся высакародствам, выявілі сапраўдны спартыўны алімпійскі дух, захавалі адданасць прынцыпам сумленнай барацьбы. Практычна ўсе буйныя нацыянальныя Алімпійскія камітэты і найбольш уплывовыя сусветныя федэрацыі па відах спорту, напрыклад Міжнародная федэрацыя футбольных асацыяцый, Еўрапейскі саюз футбольных асацыяцый, Міжнародная федэрацыя валейбола, Міжнародная федэрацыя баскетбола, Міжнародная асацыяцыя легкаатлетычных федэрацый у сваёй дзейнасці, маюць адпаведныя структуры, якія спрыяюць распаўсюджванню прынцыпаў Fair play.

Калі падсумаваць галоўныя задачы ўсіх створаных камітэтаў і падраздзяленняў, то яны зводзяцца да наступных:

1) прапагандаваць ідэі і прынцыпы сумленнай гульні, асабліва ў асяроддзі дзіцячага і юнацкага спорту;

2) узнагароджваць спартсменаў, трэнераў, спартыўныя каманды, а таксама іншых удзельнікаў спартыўнай дзейнасці, якія мелі дачыненне да высакародных учынкаў падчас спаборніцтваў, ганаровымі адзнакамі, прызамі і прэміямі.

Мэтай працы з’яўляецца звяртанне ўвагі на актуальныя праблемы сучаснага спорту, якія датычацца этычнага кампаненту гэтага віду сацыяльнай актыўнасці. На аснове аналізу фарміравання прынцыпаў сумленнай і высакароднай гульні як у іх гістарычнай рэтраспектыве, так і ў іх функцыянаванні ў сучасных умовах, вызначаюцца не толькі тэндэнцыі гуманістычнага складніка спорту, але таксама элементы дэгуманізацыі гэтага грамадскага феномена. Узнікненне, фарміраванне, станаўленне, функцыянаванне, развіццё і распаўсюджванне прынцыпаў Fair play дэманструюць гуманістычную сутнасць спорту, але ў цяперашні час паўстае ў якасці надзённай задачы трывалае замацаванне іх у свядомасці шырокіх сацыяльных колаў.

***Метады даследавання.*** Падчас напісання артыкула выкарыстоўваліся такія метады даследавання, як назіранне, апісанне, параўнанне, аналіз навуковых і дакументальных друкаваных крыніц, а таксама вывучэнне адкрытай у доступе інтэрнэт-інфармацыі.

**Вынікі і абмеркаванне**

Фарміраванне прынцыпаў Fair play, як і ўсё тое, што звязана з узнікненнем і функцыянаваннем спорту, даволі складанае для сістэматызаванага выкладу. Варта звярнуцца да гісторыі ідэі Fair play.

Што да пытання паходжання Fair play, то на гэты конт існуюць тры наступныя канцэпцыі. Паводле першай, Fair play бярэ свой пачатак у антычнай Грэцыі, дзе яго тэрміналагічным адпаведнікам было шырока зразумелае паняцце, якое абазначала «дасягненне прыстойнасці, дабра і дабрадзейнасці», ці «arête». Даследчыкі, якія прытрымліваюцца другой канцэпцыі, звяртаюць увагу на станаўленне формулы шляхетных паводзінаў, у тым ліку і падчас спаборніцтваў, у фарміраванні якой вялікае значэнне мела хрысціянства, асабліва ў Сярэднявеччы, і рыцарская культура з яе духам чыстага, без падману, з роўнасцю шанцаў паядынку. Трэцяя група спецыялістаў, якая вывучала гэтае пытанне, мяркуе, што прынцыпы Fair play спачатку ўзніклі ў спорце, а затым ужо пачалі распаўсюджвацца на іншыя сферы жыцця. Гэта звязваецца з дзейнасцю англійскіх джэнтльменаў, якія займаліся спортам на працягу XIX ст. [10, с. 61]. Неабходна таксама ўлічваць той факт, што істотным у спартыўным спаборніцтве з’яўляецца наяўнасць рэлігійнага пачатку, які паўстае як пэўная прывабнасць, пэўны ідэал. Шмат стагоддзяў перамога не была каштоўнасцю самой па сабе. Перамога трактавалася як ушанаванне багоў. Гэта было нешта большае, чым толькі вымяральны спартыўны эфект. Тут дэманстравалася сіла, прыгажосць, шляхетнасць і дабрадзейнасць [1, с. 35].

Як даводзіць Войцех Ліпоньскі, ідэя Fair play з’яўляецца яшчэ ў антычнай Грэцыі, хоць ніколі там яна не мела сённяшняй сваёй назвы. Значна пазней у часы Рымскай імперыі ствараюцца ўмовы для ўзнікнення будучай рыцарскай этыкі. Яе несвядомым аўтарам стаў у III ст. н. э. цар Галіен. Ён заснаваў конныя аддзелы, што складаліся з сыноў багатых рымскіх патрыцыяў, якія мелі высока развітое пачуццё маральнай перавагі над астатнімі жаўнерамі. Адбывалася гэта ў адпаведнасці з развіццём пэўных маральных прынцыпаў, сістэма якіх атрымала назву eques cataphractarius, і менавіта яны сталіся пачаткам стварэння рыцарскай этыкі з яе прынцыпамі шляхетнай барацьбы без падману. Прынцыпы шляхетнай барацьбы без падману вядомыя былі яшчэ і як cothrom na Feinne – гонар феніянаў. Менавіта ваяўнічыя феніяне, найверагодней, на пераломе II і III ст. н. э. першымі назвалі так прынцып, які забараняў атакаваць праціўніка з боку, з тылу, а таксама дабіваць параненых, здзекавацца са слабейшых, асабліва з жанчын, дзяцей і старых. Можна меркаваць, што ў тыя часы з’яўляецца паняцце fir fer, якое пазней прымае вядомую зараз форму Fair play. Вялікая колькасць сыноў багатых рымскіх патрыцыяў знаходзілася на тэрыторыі Брытаніі, якая ў I ст. н. э. была акупавана Рымам. Калі рымляне ў пачатку V ст. н. э. былі змушаныя адтуль зысці, традыцыя eques cataphractarius ужо даволі моцна распаўсюдзілася сярод кельтаў, асабліва сярод эліты. Уласна кажучы, менавіта кельтам належыць прыпісаць самыя старыя, даевангелісцкія падставы індывідуальнай этыкі шляхетнасці (таму што іх няма ў шмат якіх іншых праявах і старажытных помніках дахрысціянскага пісьменства: там, наадварот, дамінуе прынцып «вока за вока, зуб за зуб»). Кельты дадалі да гэтай традыцыі шмат арыгінальных рысаў, напрыклад такіх, як «шляхетны рамантызм», што часта сустракаецца ў сярэднявечнай рыцарскай паэзіі [10, с. 63–64].

У V ст. н. э. на Брытанію напалі германскія плямёны англаў і саксы. Кельцкія народы пачалі драматычную барацьбу дзеля ўратавання сваёй Айчыны. Тады ж была складзена легенда пра абаронцу Брытаніі каралём Артурам і яго рыцарамі. Легенда стала адбіткам гістарычнай рэчаіснасці, дзе сярод кельцкага рыцарства пашыраліся прынцыпы шляхетнай барацьбы. Гэтыя ідэалы сталі шанавацца асабліва высока падчас барацьбы кельтаў супраць англасаксонскіх захопнікаў у VI і VII ст. Некаторыя з брытанскіх кельцкіх народаў былі вымушаныя пакінуць выспу і перасяліцца на кантынент у Брэтань. Так рамана-кельцкая рыцарская традыцыя распаўсюдзілася па ўсёй Еўропе.

Генезіс прынцыпаў Fair play можна прасачыць яшчэ па двух іншых помніках дахрысціянскай старажытнаірландскай літаратуры – шляхецкім «Ольстэрскім цыкле» і плебейскім «Фэньянскім цыкле». Менавіта

ў іх згадваецца паняцце fer fir, якое пазней трансфармуецца ў Fair play. У дахрысціянскай Ірландыі пачалі выпрацоўвацца катэгорыі таго, што праз некалькі стагоддзяў атрымае назву рыцарства [10, с. 64–72].

Аднак англійскае Fair play як моўны выраз і адначасова як адпаведная маральная якасць, што функцыянуе ў жыцці дадзенага грамадства ці сацыяльнага слоя, з'яўляецца толькі ў XVI ст. Як тэрмін Fair play першы раз ужывае Вільям Шэкспір у сваім славутым творы «Жыццё і смерць караля Джона», і з таго часу Fair play трывала замацоўваецца ў англійскай мове. Дарэчы, В. Шэкспір нарадзіўся і жыў на кельцка-англасакскім памежжы ў XVI ст. Ён не быў ангельцам на ўсе сто адсоткаў: па лініі яго бабулі-валійкі цякла ў ім кельцкая кроў. Вялікая частка яго творчай спадчыны прысвечана менавіта кельцкай тэматыцы, напрыклад знакаміты «Кароль Лір». У іншых, «чыста англійскіх» творах – меншы, але таксама важны ўплыў культуры кельтаў. Адным з іх – кельцкае fir fer. В. Шэкспір быў першым, хто зрабіў пераклад гэтага паняцця на англійскую мову як Fair play. У згаданай п'есе пра караля Джона яно гучыць два разы. Праўда, трэба адзначыць, там не было спартыўнага кантэксту [10, с. 72].

Такім чынам, як падсумоўвае далей Войцех Ліпоньскі, можна меркаваць, што менавіта кельцкая традыцыя стварыла падставы канцэпцыі сумленнай гульні і надала ёй адпаведную лінгвістычную форму fir fer, якая каля паўтары тысячы гадоў ужывалася ў гэльскай і валійскай культуры і суіснавала там з іншымі падобнымі выразамі (cothrom na Féinne). Потым у выніку распаўсюджвання і развіцця этычных нормаў гэтае паняцце замацоўваецца ў сістэме рыцарскай культуры, а ягоная англамоўная форма прымае сучасны выгляд пасля таго, як на змену даўнім рыцарскім турнірам прыйшоў англійскі спорт [10, с. 73].

Прынцыпы Fair play, як вядома, сваю сучасную форму пачалі набываць у віктарыянскай Англіі. У той час спорт пераважна выглядаў як баўленне вольнага часу для сярэдняга і вышэйшага сацыяльнага класа. Іншымі словамі, гэта была забава, якая не прыносіла матэрыяльнага прыбытку, таму займацца спортам маглі дазволіць сабе толькі тыя асобы, якія не мелі матэрыяльных клопатаў. Вынік адыходзіў на другі план, галоўнае, на чым палягала сама гульня, – гэта яе працэс. Менавіта там былі сістэматызаваны палажэнні аматарскага кодэкса гонару:

а) гульня мае сваё заканчэнне, яна дае радасць і задавальненне ад самога ўдзелу ў ёй, а адносіны, якія накіраваныя на перамогу за ўсялякі кошт, адпаведна, грэбуюцца;

б) неабходны самакантроль, і перш за ўсё кантроль над эмоцыямі кожнага і адносінамі кожнага да перамогі ці да паражэння;

в) ідэя Fair play, г. зн. роўныя шанцы для кожнага з бакоў, ствараюць усеагульную павагу да правілаў гульні і рыцарскіх адносінаў «сяброўскага спаборніцтва» паміж сапернікамі [5, с. 36].

Трэба падкрэсліць, што характэрныя каштоўнасці, нормы справядлівасці і сумленнасці, напрыклад, у футболе былі істотнымі для англійскага сярэдняга і вышэйшага класа, якія сфарміраваліся ў віктарыянскай Англіі. Кароткі пералік уключае такія найбольш важныя складнікі, як роўныя магчымасці, добраахвотнае прыняцце законаў гульні, павага да сапернікаў. А сама сутнасць Fair play можа быць падсумавана наступнымі выказваннямі:

1) сумленны ігрок прымае законы гульні;

2) ігрок робіць усё магчымае, каб перамагчы ў межах законаў гульні;

3) ігрок, які выяўляе свае асабістыя найлепшыя якасці, дае выдатную магчымасць для саперніка прадэманстраваць таму найлепшыя якасці.

Ёсць інфармацыя пра тое, як ужо ў фінальным матчы Кубка Англійскай футбольнай асацыяцыі ў 1875 г. ідэалы Fair play былі рэалізаваныя на практыцы. У гульні паміж камандамі Royal Engineers і Old Etonians футбаліст з клуба Old Etonians атрымаў пашкоджанне і быў вымушаны пакінуць поле. Тады капітан Royal Engineers па сваёй волі сышоў з поля, каб у каманд была колькасная раўнавага [5, с. 39].

Варта зазначыць, што ў канцы XIX – на пачатку XX ст. было вельмі важна стварыць маральны арыенцір на падставе паняцця «сумленная гульня». Справа ў тым, што ў гэты час ішоў інтэнсіўны працэс адкрыцця адукацыйных, аздараўленчых і забаўляльных спартыўных інстытутаў на фоне разнастайных тэхнічных распрацовак адпаведнага абсталявання на прамысловым

узроўні для патрэбаў павялічанай колькасці клубаў і асацыяцый як для лакальнай, так і для міжнароднай сістэмы спаборніцтваў. Менавіта ў гэты перыяд адбываецца фарміраванне саюзаў і федэрацый па відах спорту на ўсіх кантынентах [8].

Хоць прынцыпы Fair play як квінтэсэнцыя еўрапейскай маральнасці шырока вядомыя, іх рэалізацыя бывае даволі разнастайнай. Можна прыводзіць шмат прыкладаў паводзінаў не-Fair сярод гандляроў і палітыкаў, якія ахвотна выкарыстоўваюць магчымасці mass media ў сваіх рэкламных мэтах і перадвыбарчых прамовах. Згаданая сітуацыя як мага лепш ілюструе распаўсюджванне ўласна спартыўных маральных прынцыпаў на больш шырокія колы сацыяльнага асяроддзя.

Fair play звязваецца з пазітыўнай спартыўнай спадчынай і традыцыяй брытанскага маральнага шляхецкага выхавання і развіцця. Ён цесна пераплятаецца з узорамі этычна-маральных нормаў штодзённага жыцця, якія не ўваходзяць у сферы палітыкі. Аднак ужо ў такім станаўленні Fair play да брытанскай рэчаіснасці палітыка падаецца як іманентная рыса так званага адрознення англійскага джэнтльмена ў паводзінах у дачыненні да іншых людзей і да самога сябе.

У 1924 г. Брытанскі алімпійскі камітэт распрацаваў для сваёй каманды на гульні VIII Алімпіяды ў Парыжы «Указанні і кодэкс спартыўных паводзінаў», якія па сутнасці ўяўлялі сабой адзін з варыянтаў Fair play. «Указанні...» падзяляліся на дзве часткі. Да першай адносіліся ўказанні для спартсмена, да другой – кодэкс спартыўных паводзінаў.

Указанні для спартсмена ўключалі наступныя сентэнцыі: займайся спортам дзеля спорту; гуляй з думкаю пра каманду, а не толькі пра сябе; навучыся перамагаць і прымаць паразы: будзь сціплы пры перамозе і прымай паражэнні з годнасцю; прымай усе рашэнні адпаведным чынам; будзь рыцарам у адносінах да пераможанага; будзь бескарыслівы і гатовы прыйсці на дапамогу іншым; будзь аб’ектыўным сведкам для абодвух бакоў; ніколі не спрачайся з суддзямі наконт іх рашэнняў.

Кодэкс спартыўных паводзінаў уключаў наступнае: паважай правілы; будзь сумленным у адносінах да свайго калегі; трымай нервы пад кантролем; падтрымлівай добрую фізічную форму; захоўвай «выраз твару» на выпадак паразы; не выказвай пагарды ў выніку перамогі; прытрымлівайся прынцыпу «ў здаровым целе – здаровы дух»; трактуй спорт як забаву.

Такім чынам, сутнасць і змест прынцыпаў Fair play фарміраваліся ў Брытаніі. У выніку свайго развіцця ў першай чвэрці XX ст. яны набываюць рысы, даволі блізкія да сучаснай інтэрпрэтацыі гэтага тэрміна [12, с. 120–123].

Усё вышэйзгаданае з’яўляецца сведчаннем таго, што ў Англіі спорт развіваўся значна хутчэй, чым на кантыненце, і таму паняцце Fair play ўвайшло ў побытавыя зносіны і стала неад’емнай часткай свядомасці джэнтльмена. У канцы XIX ст. П’ер дэ Кубэртэн стварае падставы для алімпійскай інтэрпрэтацыі Fair play, якая абапіралася на грэчаскія і брытанскія традыцыі.

Пасля з’яўлення паняцця Fair play з цягам часу ўзнікае яго дыялектычны суадносна супрацьлеглы адпаведнік Foul play (анг. брудная гульня), які абазначае такую гульню ў спорце і такія паводзіны, якія могуць быць ахарактарызаваныя як брутальныя, без захавання шляхетнасці і высакародства. Fair play усталяваўся ў англійскай мове і разам з павышэннем яе міжнароднага статусу становіцца спачатку набыткам еўрапейскай, а потым і сусветнай культуры. Дадатковым носьбітам гэтага паняцця быў, вядома, спорт, які ў сучасным сваім выглядзе мае таксама англійскае паходжанне.

Варта падкрэсліць, што сэнсавае ўтварэнне fair play увогуле з’яўляецца адным з найважнейшых англійскіх этнаспецыфічных сацыяльна-рэгулятыўных канцэптаў. На думку іспанскага даследчыка Сальвадора дэ Мадарыягі, акрамя fair play ў такую адмысловую групу трэба было б залічыць таксама self-consciousness, shy, snobbery і шэраг іншых. У выпадку fair play адбываецца рэгуляцыя адносінаў гульца як да сваіх партнёраў па камандзе, так і да сапернікаў; мяркуецца, што індывід уключае сябе ў паняцці «каманда» і застаецца ў гэтай якасці ў працэсе гульні. Хоць, з іншага боку, такое ўвасабленне зусім не абазначае адсутнасці свайго асабістага «я», а толькі стварае больш спрыяльныя ўмовы для як мага лепшага ўзаемадзеяння з партнёрамі. На падобным інтуітыўным і бесперапынным пачуцці балансу паміж індывідуаль-

ным і групавым вызначаецца сапраўдная сутнасць fair play [4, с. 50].

Калі ўзяць пад увагу яшчэ і той факт, што ў ХІХ ст. у англійскім грамадстве пачынае пераважаць сярэдні клас, паняцце fair play паўстае ў якасці найважнейшага маральнага прынцыпу, які фарміруецца падчас навучання ў публічных школах і ўвасабляецца ў крытэрыі прыстойнасці. У працэсе сацыялізацыі асобы гэта акалічнасць набывае рысы нацыянальнага характару. Fair play успрымаецца як гульня па правілах, і гэта не толькі датычыцца сістэмы спартыўнай дзейнасці, але таксама распаўсюджваецца на іншыя галіны функцыянавання грамадства. Культурагенны патэнцыял гэтага кантэнту ў англійскай лінгвакультуры выяўляецца ў тым, што гульня па правілах падкрэслівае ролю спорту ў жыцці джэнтльмена, для якога важна захоўваць прынцыпы спартыўнай этыкі, дэманстраваць непахіснасць са свайго боку ў выпадку вуснага пагаднення, ці «трымаць слова». Такое стаўленне на падставе спартыўнай этыкі дазволіла замацаваць у грамадскай свядомасці яшчэ і такія паняцці, як камандны дух, устойлівасць у выпадку паразы, станоўчыя адносіны да партнёраў і супернікаў [4, с. 51].

Паняцце fair play, як падкрэслівае Л. А. Гуніна, з'яўляецца адным з ключавых у англійскай нацыянальнай ментальнасці. «Гульня па правілах» не абмяжоўваецца толькі памерамі спартыўнай пляцоўкі – гэта паняцце трактуецца значна шырэй. Сама дэфініцыя «джэнтльмен» спалучае ў сабе добрае выхаванне і адукацыю, прывабны знешні выгляд, прыстойныя манеры, захаванне раўнавагі і адказнасць моцнага за слабага, дабрачыннасць [4, с. 55].

Катажына Смотэр слушна заўважае, што паняцце fair play варта разглядаць у розных этычных, эстэтычных, культурных, сацыяльных катэгорыях, якія затым інтэрпрэтуюцца ў шматлікіх варыяцыях. Менавіта таму так неабходна садзейнічаць іх далейшаму распаўсюджванню па ўсім свеце, каб не дайшло да іх заняпаду. У гэтым працэсе надзвычай важная роля належыць сродкам масавай інфармацыі, дзякуючы якім за самымі буйнымі спартыўнымі імпрэзамі назіраюць мільёны людзей [14, с. 186].

Кадыфікацыя прынцыпаў справядлівай барацьбы як джэнтльменскай этыкі, на думку Збігнева Краўчыка, увасабляецца ў наступных нормах:

1) выкананне правілаў гульні без атрымання карысці для ўдзельнікаў;

2) павага да праціўніка;

3) спрыянне рэалізацыі роўных шанцаў у працэсе спаборніцтваў;

4) адмова ад выкарыстання выпадковай перавагі;

5) адмова ад атрымання практычнай карысці ў выпадку перамогі;

6) максімальнае памяншэнне пакуты саперніка [9, с. 24].

Спробы ўзмацніць гуманістычную сутнасць спорту працягваюцца і ў цяперашні час. Так, ідэолагі алімпізму спрабуюць максімальна наблізіць яго асноўныя палажэнні да сучасных сацыяльных рэаліяў. Напрыклад, арганізатары Юнацкіх Алімпійскіх гульняў прапанавалі дэвіз «Excellence. Friendship. Respect» («Дасканаласць. Сяброўства. Павага»). Але, як заўважаюць Майк МакНэмі і Джым Пэры, незразумела, адкуль бярэцца гэты неалагізм і ці мае ён сувязь з больш раннімі фармулёўкамі і іншымі акцэнтамі, тым больш што фундаментальныя прынцыпы Алімпійскай хартыі яскрава падкрэсліваюць менавіта прыярытэты сумленнай гульні, спасылка на якія ў дадзенай версіі адсутнічае [11, с. 103].

Разам з тым нельга не адзначыць, што алімпійскі рух характарызуецца пэўнай мабільнасцю і ўлічвае культурныя, эканамічныя, палітычныя, навуковыя і тэхнічныя змяненні ў грамадстве, што мае працяг у філасофскім і этычным асэнсаванні. Так, 20 ліпеня 2021 г. на сесіі МАК у Токіа было ўхвалена змяненне алімпійскага дэвізу: «Citius, Altius, Fortius – Communiter» («Хутчэй, вышэй, мацней – разам»). Дадатак да традыцыйнага выразу «Citius. Altius. Fortius» 1894 г. патлумачылі тым, што захаванне місіі паляпшэння свету з дапамогай спорту можа адбывацца толькі на падставе салідарнасці.

Жан Д'Армесан, французскі акадэмік, філосаф, сябра Міжнароднага камітэта па справядлівай гульні, адносна маральнага складніка ў сістэме спартыўнай дзейнасці выказаўся наступным чынам: «Мараль праяўляецца больш шчыра падчас гульні… Сумленная гульня дазваляе нам заявіць,

што спорт не павінен стаць праявай жорсткасці. Сумленная гульня дапамагае спорту стаць складнікам цывілізацыі. Спорт – гэта не забойства, прыніжэнне і зламанне саперніка, гэта гульня з праціўнікам, у якой маюць магчымасць разгарнуцца ўсе чалавечыя навыкі» [Цыт. па: 8].

Сацыяльная напружанасць, сусветныя войны, крызісы, дыктатуры, сутыкненне эканамічных і палітычных інтарэсаў, шавінізм, нацыяналізм і тэрарызм – выпрабаванні сумленнай гульні як непасрэдна на спартыўных аб’ектах, так і па-за іх межамі. У сучасным спорце прынцып «перамога за ўсялякі кошт» працягвае дамінаваць, а гэта вядзе да празмернай жорсткасці, агрэсіўнасці, допінгу і г. д.

Fair play (а ў англійскай мове выкарыстоўваецца яшчэ таксама такое паняцце, як sportsmanship) агульна трактуецца як збор этычных і маральных законаў на падставе ўнутраных уяўленняў індывіда пра высакародства і справядлівасць у сістэме спартыўнай дзейнасці. Fair play у найбольш шырокім разуменні ўключае ў сябе:

1) павагу да саперніка;

2) павагу да правілаў і рашэнняў арбітраў;

3) адмову ад ужывання допінгу і іншых стымулятараў;

4) роўныя шанцы;

5) уменне стрымліваць эмоцыі незалежна ад выніку спаборніцтваў.

Названыя палажэнні вызначаюць сістэму паводзінаў спартсменаў і адмаўляюць імкненню да перамогі «за ўсялякі кошт».

**Заключэнне**

Такім чынам, ідэя і прынцыпы Fair play у будучыні могуць быць арыентаваны на каштоўнасці не толькі ў спорце, але і ў іншых галінах чалавечай дзейнасці. Самае складанае ў гэтым працэсе – зрабіць так, каб знешняя сістэма кантролю і пакаранняў за парушэнні акрэсленых правіл саступіла месца самакантролю [6]. Заўвага Ханса Ленка на гэты конт удала закранае характэрныя моманты рэалізацыі спартыўнай дзейнасці, калі звярнуцца да маральнай інтэрпрэтацыі правіл гульні, напрыклад, у камандных гульнях. Тактычныя фолы даўно сталі штодзённай з’явай, да іх склалася адпаведнае стаўленне, якое нельга назваць негатыўным. Хутчэй, наадварот, пад крытыку трапляюць тыя ігракі, якія ў адпаведны момант свядома не парушылі правілы, таму што ў іншым выпадку камандзе магла пагражаць страта перавагі, гол ці нават паражэнне. У прыватнасці, у футболе існуе паняцце «фол апошняй надзеі», калі адбываецца наўмыснае парушэнне правіл, каб пазбавіць саперніка яўнай магчымасці забіць гол. У выніку можа атрымацца трохразовае пакаранне для парушальніка: жоўтая (чырвоная) картка, выдаленне з поля, пенальці.

Як заўважае Ханс Гумбрэхт, з упэўненасцю можна сцвярджаць, што ў сучаснай культуры няма іншай з’явы, акрамя спорту, якая б прыносіла столькім людзям радасць прыгажосці, і калі нельга гэта прызнаць, то толькі таму, што празмерна цяжка размежаваць асалоду прыгажосцю і рытуалы «высокай культуры» [3]. Сучасны спорт характарызуецца такімі выразнымі прыкметамі, як міжнароднасць і ўніверсальнасць, якія адрозніваюць яго ад папярэдніх фарматаў у выглядзе лакальных і рэгіянальных традыцый фізічных практыкаванняў і гульняў. Ён разглядаецца не толькі як частка працэсаў мадэрнізацыі, але і як фактар працэсу глабалізацыі і ўніверсалізацыі. Яго пашырэнне суадносіцца таксама з развіццём сучасных сродкаў масавай інфармацыі, тэхналогіямі транспартных зносін і камунікацый. Спорт сімвалізуе шэраг элементарных і ўніверсальных патрэбаў. Па-першае, радасць, задавальненне, гульня; па-другое, эмацыйнае ўзрушэнне, імкненне да барацьбы праз нагрузкі, гульню і спаборніцтва; па-трэцяе, актыўна спрыяе добраму самаадчуванню і здароўю праз фізічныя практыкаванні і гульні [2, с. 38–39].

Маральныя аспекты спартыўнай дзейнасці набываюць усё большую актуальнасць у сучасным спорце. Такое становішча тлумачыцца тым, што сам спорт як сацыяльны феномен мае ўніверсальныя асаблівасці татальнага спалучэння з іншымі грамадскімі з’явамі, што на фоне глаблізацыйных змяненняў у свеце ператварае яго ў дамінанту многіх працэсаў. З улікам нарастання рацыяналістычнага (прагматычнага) стаўлення людзей да навакольнага асяроддзя стала бачным, як губляецца гуманістычны складнік чалавечай жыццёвай дзейнасці. На прыкладзе спорту гэта выяўляецца найбольш кантрасна, а калі ўзяць пад увагу тое, што ён з’яўляецца адлюстраваннем усяго

соцыуму, то становіцца зразумелай трывога за захаванне прынцыпаў «чыстай гульні», альбо, іншымі словамі, за захаванне чыстых чалавечых адносінаў. Экстрапаляцыя Fair play на іншыя галіны функцыя-навання грамадства мае сэнс у кантэксце стварэння адмысловых праграмаў у сістэме выхавання і адукацыі з тым, каб палепшыць іх станоўчы эфект і дадаць пэўную пазітыўнасць у практычнай рэалізацыі.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Люкевіч, У. Fair Play: тэорыя і практыка / У. Люкевіч. – Берасьце : Выд-ва С. Лаўрова, 1998. – 188 с.

2. Люкевіч, У. Спартыўная этыка : навуч. дапам. для студэнтаў фак. фіз. выхавання / У. Люкевіч. – Брэст, 2007. – 120 с.

3. Гумбрехт, Х. Форма насилия. Похвальное слово красоте спорта [Электронный ресурс] / Х. Гумбрехт // Неприкосновенный запас. – 2004. – № 3. – Режим доступа: https://magazines.-gorky.media/nz/2004/3/forma-nasiliya-pohvalnoe-slovo-krasote-sporta.html. – Дата доступа: 11.08.2021.

4. Гунина, Л. А. Социально-регулятивный концепт «Fair play» – «честная игра» в английской лингвокультуре / Л. А. Гунина // Вестн. РУДН. Сер.: Лингвистика. – 2009. – № 2. – С. 50–56.

5. Егоров, А. Г. Фэйр Плэй в современном спорте : учеб. пособие / А. Г. Егоров, М. А. Захаров. – Смоленск : СГАФКСТ : СмолГУ, 2006. – 188 с.

6. Ленк, Х. Этика спорта как культура честной игры. Честное соревнование и структурная дилемма [Электронный ресурс] / Х. Ленк // Неприкосновенный запас. – 2004. – № 3. – Режим доступа: https://magazines.gorky.media/nz/2004/3/etika-sporta-kak-kultura-chestnoj-igry.html. – Дата доступа: 11.08.2021.

7. Ethics / International Olympic Committee / IOC Ethics Commission. – Lausanne / Switzerland : International Olympic Committee, 2020. – 117 p.

8. History of Fair Play [Electronic resource]. – Mode of access: http://www.fairplayinternational.org/history-of-fair-play-. – Date of access: 03.08.2021.

9. Krawczyk, Z. Kategorie etyki sportu / Z. Krawczyk // Fair play – sport – edukacja / Red. Z. Żukowska. – Warszawa : Estrella, 1996. – Vol. 4. – S. 23–27.

10. Lipoński, W. Celtycka geneza brytyjskiego fair play / W. Lipoński // Fair play – sport – edukacja / Red. Z. Żukowska. – Warszawa : Estrella, 1996. – Vol. 4. – S. 61–75.

11. McNamee, M. Olympic ethics and philosophy: old wine in new bottles / M. McNamee, J. Parry // Sport, Ethics and Philosophy. – 2012. – Vol. 6, nr 2. – P. 103–107.

12. Młodzikowski, G. Memento fair play / G. Młodzikowski // Fair play – sport – edukacja / Red. Z. Żukowska. – Warszawa : Estrella, 1996. – Vol. 4. – S. 120–123.

13. Olympic Charter (in force as from 17 June 2020) / International Olympic Committee. – Lausanne / Switzerland : International Olympic Committee, 2020. – 106 p.

14. Smoter, K. Fair play gdzie teraz jesteś? / K. Smoter // Journal of Health Sciences. – 2014. – № 4 (14). – S. 182–189.

REFERENCES

1. Liukievich, U. Fair Play: teoryja i praktyka / U. Liukievich. – Bieraście : Vyd-va S. Laurova, 1998. – 188 s.

2. Liukievich, U. Spartyunaja etyka : navuch. dapam. dlia studentau fak. fizich. vychavannia / U. Liukievich. – Brest : [B. v.], 2007. – 120 s.

3. Gumbrecht, H. Forma nasilija. Pochval’noje slovo krasotie sporta [Eliektronnyj riesurs] / H. Gumbrecht // Nieprikosnoviennyj zapas. – 2004. – № 3. – Riezhim dostupa: https://magazines.gorky.media/nz/2004/3/forma-nasiliya-pohvalnoe-slovo-krasote-sporta.html. – Data dostupa: 11.08.2021.

4. Gunina, L. A. Social’no-rieguliativnyj koncept «Fair play» – «chiestnaja igra» v anglijskoj lingvokul’turie / L. A. Gunina // Viestn. RUDN. – Sier.: Lingvistika. – 2009. – № 2. – S. 50–56.

5. Yegorov , A. G. Fair Play v sovriemiennom sportie : uchieb. posobije / A. G. Yegorov, M. A. Zakharov. – Smoliensk : SGAFKST : SmolGU, 2006. – 188 s.

6. Lenk, H. Etika sporta kak kul’tura chiestnoj igry. Chiestnoje sorievnovanije i strukturnaja diliemma [Elektronnyj riesurs] / Х. Ленк // Nieprikosnoviennyj zapas. – 2004. – № 3. – Riezhim dostupa: https:// magazines.gorky.media/nz/2004/3/ etika-sporta-kak-kultura- chestnoj-igry.html. – Data dostupa: 11.08.2021.

7. Ethics / International Olympic Committee / IOC Ethics Commission. – Lausanne / Switzerland : International Olympic Committee, 2020. – 117 p.

8. History of Fair Play [Electronic resource]. – Mode of access: http://www.fairplayinternational.org/history-of-fair-play-. – Date of access: 03.08.2021.

9. Krawczyk, Z. Kategorie etyki sportu / Z. Krawczyk // Fair play – sport – edukacja / Red. Z. Żukowska. – Warszawa : Estrella, 1996. – Vol. 4. – S. 23–27.

10. Lipoński, W. Celtycka geneza brytyjskiego fair play / W. Lipoński // Fair play – sport – edukacja / Red. Z. Żukowska. – Warszawa : Estrella, 1996. – Vol. 4. – S. 61–75.

11. McNamee, M. Olympic ethics and philosophy: old wine in new bottles / M. McNamee, J. Parry // Sport, Ethics and Philosophy. – 2012. – Vol. 6, nr 2. – P. 103–107.

12. Młodzikowski, G. Memento fair play / G. Młodzikowski // Fair play – sport – edukacja / Red. Z. Żukowska. – Warszawa : Estrella, 1996. – Vol. 4. – S. 120–123.

13. Olympic Charter (in force as from 17 June 2020) / International Olympic Committee. – Lausanne / Switzerland : International Olympic Committee, 2020. – 106 p.

14. Smoter, K. Fair play gdzie teraz jesteś? / K. Smoter // Journal of Health Sciences. – 2014. – № 4 (14). – S. 182–189.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 08.09.2021*